Год II Чацьверг, 16 лютага 1922 г. 23 (32

РАНІЦА

штодзённая грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:	Цана нумару 20 марак,	ЦАНА АБВЕСТАК:
Вільня, Афярная № 4, кв. 2.	Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.	За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
Рэдакцыя адчынена што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1. Адміністрацыя—ад 10 да 3.	З перасылкай на 1 „ . . 500 „	ў тэксьце . . . . 75 м.
	За граніцу ў два разы даражэй.	за тэкстам . . . . 40 м
		Для шукаючых працы на 10 проц. таней.

Вільня, 16 лютага 1922 г.

Генэральная дыскусія, якая цяпер рака йдзе ў Віленскім Сойме над справай палітычна дзяржаўнай будучыны нашай зямелькі, ў якой высьняецца становішча розных палітычных гурткоў Сойму, цяперака дае ўжо магчымасьць прадвідзець, у якім сэнсе ў сойме будзе вырашана справа Віленшчыны.

Німа чаго казаць, што за выняткам толькі некалькіх людзей, згуртаваных каля п. Міцкевіча (Адраджэньне), ўвесь Сойм аддасьць голас за рэзалюцію, ў якой моцна і катэгарычна будзе падкрэслена далучэньне да Польшчы. Спрэчкі выклікае толькі пытаньне аб формах гэнага далучэньня.

Тагды, як нацыянальныя групы лічаць патрэбным падкрэсьліць шкоднасьць аўтаноміі, а левая частка сойму лічыць бязумоўным варункам для правільнага вырашэньня Віленскага пытаньня—злучэньне Віленшчыны з Польшай на асновах аўтаноміі, — цэнтр сойму ў асобе Радаў Людовых, займае пазыцыю, якая розьніцца тым ад пазыцыі іншых гурткоў, што вырашэньне пытаньня аб формах злучэньня пакідае суцэльна Варшаўскаму Сойму. Гэнае становішча Р. Л. у прапанаваным імі праэкце пастановы выказана ў форме „злучэньня без агаворак."

Мы ня ведаем на якія компромісы пойдуць гурткі, калі прыдзецца падаваць галасы, але цяперака ўжо пасьля таго, як выказаліся прадстаўнікі розных групаў відаць, што найбольш шансаў мае на прыняцьце прапазыцыя Рад Людовых, як рэзультат, уступак правай і левай часткі сойму.

Гэткім чынам, справа далейшага быцьця Віленшчыны зноў павісьнець у паветры і зноў будзе знаходзіцца пад уплывам розных палітычных кон'юнктур, якія будуць мець у канцы концоў рашучае значэньне для вырашэньня Варшаўскім Соймам справы аб формах злучэньня.

Што палітычны момант будзе тутака найважнейшым, праконваюць нас прамовы староньнікаў аўтаноміі ў Віленскім Сойме, якія выказываючыся за аўтаномію, як найважнейшы матыў, выстаўлялі той факт, што злучэньне без аўтаноміі зачыніць дзьверы для Польска-Літоўскага збліжэньня.

Праўда, яны падкрэсьлівалі і існаваньне іншых прычын як, разнахарактэрнасьць народаў засяляючых Віленшчыну, спэцыяльных эканамічных варункаў, і г. д., але усё-ж, відаць было, што для нашых аўтанамістаў найважнейшым момантам ёсьць момант палітычны—момант Польска-Літоўскага збліжэньня.

Трэба праўду сказаць, што гэныя палітычныя варункі шмат залежаць ад становішча Ковенскага ураду, які дагэтуль рабіў усё тое, каб пекныя помыслы лепшай часткі тутэйшага грамадзянства, помыслы стварэньня варункаў вольнага разьвіцьця ўсіх народаў Віленшчыны, спыніць бязсьледна.

Апошні акт Ковенскага ураду—нyпрызнаньне Віленскага сойму за вырэзіцеля волі народу, гэта новы крок у гэным кірунку. За крок гэны на Ковенскі урад ляжа ўся адказнасьць. І як бы ён ня крычаў на усю Эўропу, як бы ня зьменшаў значэньня Віленскага Сойму, —воля яго скіне з Коўны карону суверэна Віленшчыны, якая хоча жыць адным дзяржаўным жыцьцём з Польшчай.

ТЭЛЕГРАМЫ.

ВАРШАВА 14. II. (А. У.). Шардыні, які знаходзіцца цяпер ў Варшаве, незалежна ад даручэньняў сэкрэтарыяту Лігі Народаў, разгледзіў справу арыштаваньня беларусаў і літоўцаў ў Вільні і зробіць даклад аб гэтым Лізе Народаў у Жэнэве.

ВАРШАВА 14. II. (А. У.). „Kurjer Porannу" паведамляе, што кс. арц. Тэодоровіч мае намер адмовіцца дэлегацкага мандату.

ВАРШАВА 14. II. (А. У.). Рада міністраў прыняла прапазыцыю аб назначэньні Мечыслава Міцкевіча Валынскім ваеводаю.

ВАРШАВА 14. II. [А. У.). „Kurjer Porannу" паведамляе, што Адам Тарноўскі прыймае пасаду дырэктара Расчотнага Банку.

ВАРШАВА 15. II. (А. У.). Міністр Даўнаровіч, які ездзіў у Спалу для дакладу Начальніку Дзяржавы аб ходзе нарадаў Віленскага Сойму, а так сама прадстаўленьня апрацованага Варшаўскім Соймам праэкту арганічнага статуту для Віленшчыны, — учора вечарам вярнуўся і ў гэтых справах адбыліся дыскусіі Палітычнага Камітэту Рады Міністраў.

ВАРШАВА 15. II. (А. У.). Доктар Збігнеў Смолка, кіраўнік ліквідацыйна-трактатавага Аддзелу польскага Пасольства у Вэне, выехаў учора ў Рым, як польскі дэлегат на копфэрэнцыю новастворaных дзяржаў.

ВАРШАВА 15. II. (А. У.). На ўчарайшым паседжаньні Сойму прынята ў трэцьцім чытаньні павялічэньне гадзін працы ў гандлі. Час прадажы тавару і адкрыцьця склепаў, за выключэньнем аптэк і сталовых, прадоўжаны да 10 гадзін. Прапазыцыя аб перарыве на абед для склепаў ня прынята. Аднак, наёмныя працоўнікі павінны быць заняты працаю ня болей як 8 гадзін. Далей Сойм ў другім чытаньні прыняў праэкт аб скасаваньні міністэрства Культуры і Мастацтва, функцыі якога пераходзяць да Міністэрства Асьветы і Рэлігіі.

ВАРШАВА 15. II. (А. У.). Польска-Савецкія санітарныя нарады будуць адбывацца ў Рызе. На чале польскай дэлегацыі будуць Іодко і Нарзевіч.

ВАРШАВА 15. II. (А. У.). У адказ на тэлеграму вайсковага біскупа Галля, атрымана з Рыму ад імя сьв. Айца гэткая тэлеграма: „прыймаючы айцоўскім сэрцам выказы вернасьці, сьв. Айцец перасылае Апостальскае благаслaвеньне Табе, вайсковаму духавенству і усей польскай арміі.—Кардынал Гаспарры".

З Віленскага Сойму.

У панядзелак у 5 гадзіне 35 мін. кіруючы паседжаньнем віце-маршалак Фэдаровіч адкрыў пятае паседжаньне Віленскага Сойму. На парадку дня — камунікаты Маршалка, інтэрпэляцыі, прапазыцыі і генэральная дыскусія па дакладу Палітычнай Камісіі. Пераходзячы да першага пункту парадку дня, віцэмаршалак прызнаў пратаколы 2-га і 3 га паседжаньняў затверджанымі і паведаміў, што пратакол 4-га паседжаньня знаходзіцца ў Соймовай Канцэлярыі для прагледжаньня.

Затым сэкрэтар Галко прачытаў інтэрпэляцыі:

1) У справе дапамогі для вайсковых інвалідаў і іх сем'яў (R. L.)

2) У справе прыватнай парцэляцыі зямлі (P. S. L. і дэмакраты)

3) Аб надзеле зямлёю жаўнераў ахвотнікаў (P. S. L. і дэмакраты)

4) Аб распрадажы прыватных лясоў (P. S. L., дэмакраты і P. P. S.)

5) Аб памяшканьнях для люднасьці прыфрантовай паласы (P. S. L., дэмакраты і P. P. S.)

Усе інтэрпэляцыі адасланы ў Камісію па запросам.

Далей прачытаны гэткія прапазыцыі:

1) Прапазыцыя пасла Стэфановіча („Адраджэньне-Вызваленьне") ў справе надзеленьня зямлёй дэмобілізованых жаўнераў, якія не находзяць з тэрыторыі Сярэдняй Літвы, па некарысьць тутэйшай малазямельнай і беззямельнай люднасьці.

2) Прапазыцыя п. Хамінскага („Адрадж.-Вызв.") ў справе найхутчэйшага правядзеньня зямельнай рэформы.

Маршалак заяўляе, што гэтыя прапазыцыі будуць разгледжаны па адным з найбліжшых паседжаньняў, і далей адзначыў, што ў апошні момант паслы з клюбаў P. S. L. і дэмакратаў падалі сьпешную прапазыцыю аб надзеленьні зямлёй жаўнераў-ахвотнікаў і ў першую чаргу, як першага абаронца генэрала Жэлігоўскага. Але з прычыны, што прапазыцыя падпісана толькі 10, а не 12 асобамі, і што яна ўнесена па аб'яўленьні парадку дня, маршалак пастанавіў, што яна будзе разглядацца на другім паседжаньні.

Затым прыступаюць да генэральнай дыскусіі.

Першым з прамоваю выступае п. Янікоўскі (Rady Ludowe).

Адзначыўшы, што лёс Віленшчыны могуць рашыць толькі яе прадстаўнікі, якія знойдуць у сабе досыць сілы, каб даць адпор ворагам, Янікоўскі падкрэсьлівае расейскую апаснасьць з якою раз назаўсёды трэба скончыць.

Урад Ковенскай Літвы таксама ня мае ніякага права да Віленшчыны. Ліга Народаў ня магла разрашыць пытаньня аб дзяржаўнай прыналежнасьці Віленшчыны, гэта можа зрабіць толькі Віленскі Сойм, а для гэтага яго прадстаўнікам трэба ўвайсьці ў склад Варшаўскага Сойму, дзеля таго што Віленшчына ёсьць часткай Польшчы, і Польскі Урад павінен прыняць уладу над Віленшчынай. Каб наш край быў адданы Літве, то ў ім заўсягды былі-б непарадкі.

У канцы прамоўца падкрэсьлівае высока — патрятычнае становішча ўсіх соймавых партый і кончыць славамі: „Адкрываем карту нашай гісторыі і на ненапісанай страніцы ставім адно, але вялікае слова: Тут ёсьць і будзе Польшча."

Пасол Ясінскі (Z. S. N.) дае характэрыстыку гісторыі Віленшчыны ад часу заняцьця яе польскімі вайскамі, засьцярагаючы, каб у сваёй пастанове Сойм адкінуў усё тое, што адмежоўвае Віленшчыну ад Польшчы, ссылаючыся на прыклад Расеі, Англіі і асабліва Аўстрыі, якая распалася дзякуючы аўтаноміі, якой карысталіся заселяючыя яе народнасьці, прапануе прыняць праграму далучэньня Віленшчыны да Польшчы.

Пасол Сьвяхоўскі (P. S. L.) падробна застанаўляецца на гісторыі Польска-Літоўскіх адносін з часоў Тарыбы і, падкрэсьліўшы варожасьць адносін літоўцаў да палякаў і немагчымасьць дайсьці цяпер з Літвою да паразуменьня, лічыць зусім зразумелым імкненьне Віленшчыны да Польшчы. Далей прамоўца адзначвае тыя труднасьці ў разрашэньні Віленскага пытаньня, якія стаяць у зьвязку, з так званай „лініяў Кэрзона" і 87 параграфам Вэрсальскага трактату, ў чым абвінавачвае Грабскага і эндэкаў. У канцы, паказаўшы, што вялікая будучына Польшчы павінна быць аснована на згодным сажыцьці з усімі нацыянальнымі меншасьцямі, што жывуць на тэрыторыі Польшчы і малымі суседнімі народамі і што палякі ня маюць ненавісьці да Літвы,—п. Сьвяхоўскі выказваецца за прыняцьце праэкту дэкларацыі Палітычнай Камісіі, пакідаючы за сабою права ўнесьці папраўкі.

П. Рачкоўскі (Z. S. N.), адзначыўшы два напрамкі ў рашэньні Віленскага пытаньня—далучэньне і аўтаномія, кажа, што аўтаномія можа вызваць заграніцай некарысныя для Польшчы погляды, дзеля таго, што заграніцай дрэнна паінфармованы аб адносінах на Віленшчыне. Трэба каб дэлегацыя Віленскага Сойму запрапанавала Польскаму Ураду і Сойму безварунковае далучэньне Віленшчыны да Польшчы.

П. Хамінскі (Адраджэньне—Вызваленьне) кажа, што яго прапазыцыя, ўнесеная на апошнім паседжаньні Сойму, была спаткана правымі групамі са сьмехамі і ироніяй і што можа яго цяпер зразумеюць. Віленская зямля заселена галоўным чынам палякамі, але тут жыве многа і другіх нараднасьцяў: беларусы, жыды, літоўцы. Каждая дзяржава павінна дбаць, каб усім яе грамадзянам жылося добра, дзеля гэтага яго партыя стаіць за фэдэрацыю, якая дасьць магчымасьць жыць у згодзе з суседнімі народамі і бараніцца ад ворагаў, а ў першую чаргу ад навалы Расейска-Нямецкай. З прычыны адсутнасьці зразуменьня гэтага ў ўрадавых сфэрах Ковенскай Літвы, партыя бачыць разрашэньне Віленскай справы ў сучаны момант у аўтаноміі. Прамоўца востра крытыкуе Рыскі трактат, у сілу якога Беларусь засталася падзеляна на дзьве часткі і Польшча страціла контакт з рэштай Беларусі, ў чым бачыць віну тых, што прадстаўляў Польшчу пры заключэньні гэтага трактату і адзначае, што ў той час, калі Ковенская Літва зразумее якой небязпекай пагражае яе існаваньню Расейска-Нямецкі саюз, яна пойдзе на збліжэньне з Польшчай.

На гледзячы на тое, што Польская Канстытуцыя з'яўляецца аднэй з найлеп-

шых і на падстве не прынята штам добрых пастановаў,—яны да гэтага часу ня праведзены ў жыцьцё, прычыну чаго прамоўца бачыць у цэнтралізацыі ўраду, а так сама ў становішчы, якое займаюць правыя партыі. Дзеля гэтага п. Хомінскі падкрэсьлівае патрэбнасьць злучэньня з Польшчай, але жадае ўласнага аўтана[мічнаг]а Сойму для Віленшчыны і ве[рыць], што Польшча дасьць гэты Сойм.

Пераходзячы да рэзалюцыі Палітычнай Камісіі прамоўца ад імя сваей партыі выказвае згоду ў тым выпадку, калі папраўкі іншых партый будуць мець у[плы]ў на зьмену сутнасьці рэзалюцыі.

П. Нусбаум (Рады Людовыя) выказваецца за безварунковае далучэньне да Польшчы і адзначае, што праведзеньне зямельнай рэформы можа быць вырашана толькі Варшаўскім Соймам.

П. Абрамовіч (P. S. D.) адзначае патрэбнасьць згоды з суседнімі народамі, з прычыны Расейска-Нямецкай небяспекі.

Энгель (Z. Ś. i U. N.) у палеміцы з левымі групамі лічыць, што прычынаю заблутанасьці Віленскай справы з'яўляецца становішча, якое займалі левыя партыі у гэтай справе.

Пасьля прамовы Энгеля Маршалак прарывае дыскусію і назначае наступнае паседжаньне ў аўторак, а 5 гадзіне па палудні.

Паседжаньне 14 лютага.

Прамова дэлегата Багінскага.

(P. P. S.) Дэлегат п. Багінскі ў сваей прамове падкрэсьліў, што Віленскі Сойм павінен выпаўніць вялікую палітычную роль, прадугледжваючы ўсе палітычныя магчымасьці. Вайна прынесла нацыянальную сьвядомасьць рабочаму класу, цяпер можна сказаць, што польскі рабочы лічыць сябе паляком.

Потым прамоўца перайшоў да крытыкі прынцыпаў прылучэньня (wcielenia) і аўтаноміі і даводзіў гаспадарчыя выгады аўтанамічнай лучнасьці Віленшчыны з Польшчай.

Далей п. Багінскі падкрэсьліў канечнасьць зрыва ўсялякіх адносін з Расеяй і сказаў, што P. P. S. не згаджаецца на камраміс, які прапанаваў п. Міцкевіч.

Потым перайшоў да разбору дэклярацыі P. P. S. Дэклярацыя гэта мае дзьве часьці: прынцыповую і выканўчую.

Прамова дэлегата Станевіча P. S. L.

У сваей прамове п. Станевіч гаворыць аб польскасьці Віленшчыны, аб тым, што праз колькі дзён будзе зацьверджана Соймам належнасьць Віленшчыны да Польшчы, і выказвае жаль, што гэтым зацьверджаньнем мы аддзяляемся ад палякаў, якія застаюцца ў Ковенскай Літве. Далей ён сказаў: „мы ідзем да Польшчы без усялякіх агаворак, але калі мы цяпер ужо гаворым аб Віленшчыне, як аб асобнай частцы Польшчы, дык можна гаварыць і аб патрэбах народу гэтай часткі, аб самаўрадзе ці аўтаноміі“

⟡⟡⟡⟡

Палітычныя весткі.

Справа конфэрэнцыі у Гэнуі.

У справе францускай ноты, датычачай адсрочкі конфэрэнцыі ў Генуі—Лёйд-Джордж проціў адсрочкі. Аднак, некалькі яго таварышаў па габінэту думаюць іначай. Весткі аб тым, што быццам Англія перадае справу адсрочкі конфэрэнцыі на разгледжаньне камісіі англійскіх, італьянскіх і францускіх экспэртаў—непраўдзівыя.

З Рыму паведамляюць, што дзеля ўрадовага крызісу ў Італіі конфэрэнцыя магчыма будзе адсрочана, на каротшы тэрмін, як прапануе Францыя.

Агульная забастоўка у Гішпаніі.

У Гішпаніі пачалася агульная забастоўка.

Камісія Лігі Нароаў у Варшаве.

У Варшаву прыехала кантралюючая камісія Лігі Народаў і прабудзе тамака колькі дзён; паўнамоцтва камісіі канчаюцца 15 лютага. Старшыня дэлегацыі, паміма іншых даручэньняў Лігі Народаў, гаварыў аб арыштах літоўцаў і беларусаў у Вільні і напісаў аб гэтым даклад для Лігі Народаў у Жэнэве.

У Ковенскай Літве.

Складзены новы габінэт міністраў: прэзэс—Гальванаускас, міністр абароны краю—Сліжыс, міністр унутраных спраў К. Олека, міністр скарбу—Ян Дабкавічыус, міністр земляробства—Ян Алекса, міністр асьветы—праф. Іодскіс, міністр справядлівасьці—Коробліс, міністр дарог—Пётр Вілейшыс, міністр жыдоўскіх спраў—доктар Макс Салавейчык, міністр беларускіх спраў будзе назначаны асобна.

На паседжаньні Ковенскага Сойму 8-га лютага сацыял-дэмакраты і народныя-сацыялісты зрабілі абструкцыю. Калі большасьць Сойму прыняла як першы пункт нарадаў Сойму разгледжаньне унівэрсытэцкага устава,—дэлегаты абедзьвых партыяў вышлі з салі паседжаньня. Дзеля браку кворуму—паседжаньне было закрыта на поўгадзіны. Перагаворы з гэтымі партыямі ніякага выніку не далі.

Міністр заграніцных спраў Юргутіс паслаў Расеі пратэст проціў невыпаўненьня варункаў мірнага дагавора.

Нямецка-Расейскае зьбліжэньне.

На расейска-нямецкім паседжаньні ў Маскве нямецкі прадстаўнік падкрэсьліў супольнасьць гаспадарчых інтарэсаў абодвых краёў і сказаў, што Германія ўжо гатова да супрацоўніцтва пры гаспадарчай адбудове Расеі.

Дарма гінуць.

„Dzien. Pozn.“ падае апавяданьне аднаго з служачых па рэпатрыацыі, які вярнуўся з Расеі:

„Калі наш цягнік прыбыў на станцыю Негарэлае—польскага цягніка яшчэ ня было. Праз 1 з пал. гадзіны ён надыйшоў, але меў магчымасьць узяць толькі каля 500 асоб, а усіх чакала ў полі каля 3500. Была зроблена пастанова забраць у першы чарод самарскі эшалон. Рэшта засталіся на марозе ў полі і чакалі яшчэ тры гадзіны, потым хаваючыся ад холаду кінуліся на санітарны цягнік, але куды там! Ледзьве ўпіснулася да 1800 асаб, рэшта засталася ў ночы на полі.. Калі на раніцы мы з п. Янам Бельскім выйшлі з вагону, я ўгледзеў, што ўздоўж цягніка на зямлі ляжалі кучы лахманоў, ў якіх зарыўшыся спалі на снягу мужчыны, кабеты і дзеці... Мы пачулі жаласны енк і стогны... З пад лахманоў тырчалі сіня-жоўтыя рукі і ногі—гэта былі ўжо мертвецы...

„Прыбыла ў дзеравяныя баракі ў Баранавічах цэлая сямья—піша другі сьведка.—Дзяцей палажылі на сякой такой пасьцелі і яны хутка заснулі. Бацькі драмалі... У ночы раптам іх разбудзіў страшны хрып: тры хлопцы корчыліся ў канвульсыях... Бацька кінуўся па доктара, ледзьве знайшоў праз дзьве гадзіны і прывёў яго, але... хлопцы ўжо сканалі ў страшэных муках...

Выявілася, што дызінфекцыраваныя пасьцелі яшчэ мелі ў сабе атрутныя газы, што і было прычынай сьмерці дзяцей“!

Страшэнны жах бярэ, калі чуеш аб гэткіх выпадках!

Мімаволі з'яўляецца пытаньне: няўжо-ж ня можна зрабіць так, каб гэтыя жахі болей не паўтараліся?

Здаецца,—што можна, але..., трэба толькі болей працы, болей энэргіі і болей сардэчнага вучасьця да тых мучанікаў, якія шчасьліва вырваўшыся з пазуроў чразвычайкі, з бальшавіцкага „раю“, гінуць на парозе сваей хаты.

А. В.

Разгром насяленьня у Карэліі.

(Ліст з Гельсінгфорсу).

Як паведамляюць з Гельсінгфорсу і Карэліі, тры бальшавіцкія паўкі з артылерыяй пацяснулі некалькі маленечкіх паўстанчых атрадаў, якія перайшлі граніцу Фінляндыі і былі разаружаны. Пасля гэтага бальшавікі уварваліся на тэрыторыю Фінляндыі і пачалі нішчыць вёскі, рабаваць і забіваць селян, нібы-то за тое, што яны хаваюць паўстанцаў. Аднычасна выступілі і фінскія бальшавікі і раскідалі праклямацыю у Гельсінгфорсе, Улеабаргу і ў іншых мейсцах. Але бальшавіцкая агітацыя не памагала. Насяленьне аднеслося да бальшавікоў вельмі варожа, на вёсках навет былі выпадкі крывавай расправы з агітатарамі.

Фінская Улада у Гельсінгфорсе, адтрымаўшы вёсткі аб тым, што бальшавіцкія атрады перайшлі граніцу, зараз жа адправіла Фінскае войска, а жыцелі Куопіоскага і Улеаборгскага вокругаў арганізавалі самаабарону.

Афіцыяльна Фінская Улада абвесьціла, што граніцу перайшлі не камуністычныя войскі, а шайкі бандытаў.

Агульнымі высілкамі фінскіх атрадаў і мейсцовай самаабароны камуністычныя атрады былі выгнаны за граніцу, а тамака напалі на іх карэльскія паўстанцы і зьніштожылі.

Так сама і другія бальшавіцкія атрады, якія ішлі на поўнач Фінляндыі, пацярпелі паражэньне і адыйшлі да расейска-карэльскай граніцы.

Адходзючы пад націскам паўстанцаў, бальшавікі нішчаць да чыста вёскі, забіваюць жыцялёў, не шкадуючы навет жанок і дзяцей. Мірнае насяленьне Карэліі уцякае у Фінляндыю, кідаючы родныя хаты і усю ўласнасьць.

З Тэрыок паведамляюць, што бальшавікі сконцэнтрыравалі у ваколіцах Белоострава значныя сілы.

⟡⟡⟡⟡

Весткі з Варшавы.

Адкрыцьце новага пункта.

3-га Лютага Польскай Уладай адкрыты новы кантрольна-прапускны пункт для рэпатрыантаў пры станцыі Дорогуск на Бугу.

Пры пункце знаходзіцца бальніца на 600 ложкаў, дэзынфэкцыйная камера і лазня. Баракі для бежанцаў адрэмантырованы занова. Для сямейных асобныя памешканьня. Цягнікі з бежанцамі у Роўні затрымлівацца ня будуць — іх будуць напраўляць непасрэдна.

Здароўе міністра Сікорскага.

Здароўе міністра жалезных дарогаў п. Сікорскага пагоршылася. Дзеля папраўленьня здароўя міністр выезджае у Мерану.

На час хваробы п. Сікорскага мейсца міністр займе інжынер Эбергардт.

Здароўе прэзэса Міністраў.

Здароўе прэзэса міністраў п. Панікаўскага палепшылася. У панядзелак Прэзэс прыступіў да выкананьня сваіх абвязкаў.

Ад'езд Карахана.

10 Лютага у вечары Карахан выехаў у Москву. Як паведамляюць Карахан заступіць мейсца Чычэрына, які паедзе на конфэрэнцыю у Генную.

⟡⟡⟡⟡

Навакола Сойму.

52 прамоўцы.

У справе пытаньня аб Віленшчыне у Старшыні Сойму запісалася 52 прамоўцы. Дэбаты зацягнуцца на некалькі дзён.

Запросы.

У Сойм унесены новыя тэрміновыя запросы аб прыняцьці энэргічных крокаў для хутчэйшай адбудовы Віленшчыны і аб арганізацыі барацьбы з пьянствам.

Эндэкі зьбіраюцца унясьці запрос аб павароце з Саўдэпіі бежанцаў-чужаземцаў. Кажуць, што гэты запрос будзе падтрыманы і цэнтрам.

Зямельнае пытаньне.

Згодна соймаваму аграрнаму закону у першы чарод будуць надзелены зямлёю ахвотнікі польскай арміі і інваліды. Пасьля гэтага атрымаюць землю беззямельныя і малазямельныя.

Закон прадугледае прымусовы выкуп.

Прадстаўнікі нэйтральнай зоны.

Прадстаўнікі нэйтральнай зоны, якія прыбылі ў Сойм, кажуць, што яны з'яўляюцца прадстаўнікамі ад 75 проц. усяго насяленьня. Па славам дэлегатаў, жыцелі нэйтральнай зоны жадаюць далучэньня да Польшчы.

Дэлегацыя Сойму.

Дэлегацыя Сойму паедзе ў Варшаву у канцы гэтага тыдня.

Візыты.

Старшыня Сойму і рэктар Віленскага унівэрсытэту абмяняліся візытамі.

Просьба жыхароў нейтральнай паласы да Віленскага Сойму.

Жыхары 115 весак, засьценкаў і фальваркаў нэйтральнай паласы на поўнач ад Вільні зьвярталіся не адзін раз з просьбаю да польскай улады аб тым, каб адбыліся выбары да Віленскага Сойму і ад гэтай часткі Віленшчыны, аднак просьба іх ня была выпаўнена. Цяпер жыхары той паласы, ня хочучы далей цярпець бязустанныя гвалты літоўскіх бандаў, і улад—выбралі сваіх прадстаўнікоў і просяць Віленскі Сойм прызнаць іх за правідлова выбраных членаў Сойму.

ХРОНІКА.

Рэвізія паліцыі.

Рэвізія паліцыі, якая вядзецца гарадзкім старастай п. Вімборам, скора будзе закончана.

У Каапэратыве служачых Віленскай дырэкцыі

У Каапэратыве служачых Віленскай жалезнадарожнай дырэкцыі адкрыта растрата двух міліёнаў марак. Вядзецца следства.

З магістрату.

15 лютага 1922 г., а 9 гадзіне вечарам адбудзецца супольнае паседжаньне мешанай і фінансавай камісіі з удзелам прадстаўнікоў ад сувязі гарадзкіх працаўнікоў і работнікаў. На парадку дня справа набораў гарадзкіх працаўнікоў за гэты месяц.

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч.

Друкарня „Друк“ Субач 2.